МІНІСТЭРСТВА АДУКАЦЫІ РЭСПУБЛІКІ БЕЛАРУСЬ
БЕЛАРУСКІ ДЗЯРЖАЎНЫ УНІВЕРСІТЭТ
ФАКУЛЬТЭТ ФІЛАСОФІІ І САЦЫЯЛЬНЫХ НАВУК
Кафедра сацыяльнай камунікацыі

ПІКАС Аліса Сяргееўна

# САЦЫЯЛЬНЫЯ СЕТКІ
# ЯК ІНТСРУМЕНТ ПРАСОЎВАННЯ АРГАНІЗАЦЫІ

Дыпломная праца
АНАТАЦЫЯ
Спецыяльнасць 1-23 01 15 Сацыяльныя камунікацыі

Навуковы кіраўнік:
старшы выкладчык
Д.С.Краскоўская

Мінск, 2025

# АНАТАЦЫЯ

Структура дыпломнай працы складаецца з увядзення, трох частак і заключэння. У першым раздзеле працы зроблены тэарэтычны аналіз сацыяльных сетак як камунікацыйнай платформы, вызначаны сутнасць і асаблівасці дадзенай з'явы, раскрыты мэты, задачы і функцыянал SMM, а таксама праведзены агляд сучасных трэндаў у дадзенай вобласці. У другім раздзеле ўвага нададзена спецыфіцы прасоўвання музычных арганізацый. Разгледжаны асновы лічбавага маркетынгу ў музычнай індустрыі, прааналізаваны магчымасці фарміравання музычнага брэнда ў сацыяльных сетках і вызначаны сучасныя тэндэнцыі, якія ўплываюць на развіццё гэтай сферы. Практычная частка даследавання прадстаўлена ў трэцім раздзеле, дзе на прыкладзе даччынай кампаніі "RED RUM RECORDS" ТАА "МІНСК АКТЫЎ ТОРГ" праведзены комплексны аналіз мэтавай аўдыторыі, выбар аптымальных платформаў для прасоўвання, а таксама распрацаваны метады стварэння кантэнту і ўзаемадзеяння з падпісчыкамі.

Аб'ём дыпломнай працы складае 56 старонкі, уключае ў сябе 13 малюнкаў, 1 табліцу, 3 дадаткі.

Ключавыя слова: сацыяльныя сеткі, мэтавая аўдыторыя, рух, кантэнт, SMM (сацыяльны медыя-маркетынг), лічбавы маркетынг, брэндынг, музыка кантэнт-маркетынг, сацыяльныя платформы.

Мэта дыпломнай работы – з'яўляецца аналіз і выяўленне ключавых фактараў, якія садзейнічаюць пасяховаму прасоўванню арганізацый з выкарыстаннем сацыяльных сетак, без фінансавых укладанняў.

Аб'ект дыпломнай працы – з'яўляюцца сацыяльныя сеткі як камунікацыйная пляцоўка, якая выкарыстоўваецца для прасоўвання студыі гуказапісу.

Прадмет дыпломнай працы – з'яўляецца працэс прасоўвання студыі гуказапісу, а менавіта – канкрэтныя маркетынгавыя і камунікацыйныя механізмы, якія прымяняюцца ў SMM для павелічэння пазнавальнасці і эфектыўнасці прасоўвання.

Метадалагічную аснову складае тэарэтычны аналіз сутнасці сацыяльных сетак, канцэпцыі SMM і асноўных трэндаў лічбавага маркетынгу, аналіз канкурэнтнага асяроддзя, прымяненне метадаў комплекснага аналізу мэтавай аўдыторыі, выбару аптымальных лічбавых платформаў (Instagram, Telegram, TikTok, Twitch) і распрацоўкі кантэнт-стратэгіі для прасоўвання, распрацоўка кантэнт-плана.

Вынікі даследавання дапамогуць стварыць эфектыўныя маркетынгавыя стратэгіі і рэкамендацыі для прасоўвання брэндаў у сацыяльных сетках, з

улікам спецыфікі музычных арганізацый і асаблівасцей выбранай мэтавай аўдыторыі, без якіх-небудзь фінансавых укладанняў.

Вынікі і матэрыялы дыпломнай працы былі атрыманы на падставе дакладных крыніц і самастойна праведзеных даследаванняў.